ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
"ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА АСІПОВІЦКАГА РАЁНА"
Цэнтральная раённая бібліятэка

# АДЗІН З ПЕРШЫХ:
# Сцяпан Сумчанка



Сцяпан Сяргеевіч Сумчанка – адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласціў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Нарадзіўся Сцяпан Сяргеевіч 18 сакавіка 1906 года ў сяле Войнаўка Александрыйскага раёна Кіраваградскай вобласці. Бацькі яго былі беззямельнымі сялянамі, так што працаваць Сцяпану давялося з маленства.

У 1928 годзе 22-гадовы хлопец быў прызваны на тэрміновую службу ў Чырвоную армію. Ён стаў ваенным якраз у той перыяд, калі Чырвоная Армія завяршала балючы і доўгі працэс структурнага пераходу ад самастойных фарміраванняў перыяду грамадзянскай вайны да жорсткай цэнтралізацыі кіравання і ўступала ў перыяд тэхнічнага пераўзбраення. Перш за ўсё перамены праходзілі ў кадравым саставе – праслаўленыя ветэраны эпохі грамадзянскай вайны ішлі ў адстаўку, а іх месцы займала прагнуўшая праявіць сябе моладзь. Так што ваенная кар’ера ў той час рабілася хутка.

Сумчанка, які спачатку вучыўся ў палкавой школе і праявіў патрэбныя для кадравага вайскоўца здольнасці, быў накіраваны ў Новапецяргофскую школу пагранічнікаў. У 1930 годзе быў прызначаны камандзірам аддзялення, а ў 1932 годзе, пасля заканчэння гэтай пагранічнай школы, – камандзірам кавалерыйскага манеўранага ўзвода Ташрабацкай асобнай пагранічнай камендатуры ў горадзе Нарын Кіргізскай ССР, затым прызначаны начальнікам Ташрабацкай камендатуры, а пазней упаўнаважаным АДПУ па барацьбе са шпіянажам. У 1938 годзе за выкананне баявога задання па ахове дзяржаўнай граніцы Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Сцяпан Сяргеевіч Сумчанка быў узнагароджаны медалём “За адвагу”.

На пачатку вызвалення Заходняй Беларусі Сумчанку пераводзяць памочнікам начальніка 11-га Себежскага пагранічнага

атрада, а 12 снежня 1940 года начальнікам Слонімскага гарадскога аддзела НКДБ Баранавіцкай вобласці.

22 чэрвеня 1941 года войскі гітлераўскай Германіі вераломна ўварваліся на тэрыторыю СССР. У гэты час Сумчанка эвакуіраваў дакументы, асабовы склад і сем'і супрацоўнікаў Слонімскага гараддзела НКДБ у Магілёў, дзе часова размясціўся наркамат Дзяржаўнай бяспекі рэспублікі.

З мэтай барацьбы са шпіёнамі і дыверсантамі ў канцы чэрвеня 1941 годаў Магілёве з ліку прыбыўшых чэкістаў фарміраваліся знішчальныя атрады. Камандзірам аднаго з такіх атрадаў быў прызначаны начальнік аддзялення УНКДБ Баранавіцкай вобласці капітан Кірыл Андрэевіч Рубінаў. У яго атрад увайшлі: Сцяпан Сяргеевіч Сумчанка, Мікалай Афанасьевіч Міхайлашаў, Іван Макаравіч Стэльмах, Фёдар Лапачоў, Міхаіл Вінаходаў і іншыя. 29 чэрвеня атрад пачаў баявыя дзеянні на тэрыторыі Клічаўскага раёна.

Затым пастурпіў загад наркома ўнутраных спраў: атраду застацца ў тыле ворага для арганізацыі партызанскай барацьбы з акупантамі.

Фронт набліжаўся. Група была адрэзана ад Вялікай зямлі. Капітан Рубінаў прапанаваў дробнымі групамі разысціся па бліжэйшых раёнах.



На былым партызанскім аэрадроме каля в. Градзянка

К. Рубінаў, С. Сумчанка, І. Стэльмах, начальнік Асіповіцкага РА НКДБ С. Мазур, яго супрацоўнікі І. Лебедзеў, І. Барбакоў пайшлі ў Асіповіцкі раён. На шляху сустрэлі другога і трэцяга сакратароў Асіповіцкага РК КП(б)Б Р. Х. Голанта, А. В. Шыёнка і старшыню Асіповіцкага райвыканкома М. П. Каралёва. Параіўшыся, вырашылі размясціцца ў Асіповіцкім раёне недалёка ад Градзянкі, ва ўрочышчы Расоха. Гэта група на чале з М. П. Каралёвым стала ядром арганізацыі партызанскага руху ў раёне. Маючы веды і практычны вопыт у баявой службе і чэкісцкай рабоце, Сумчанка стаў адным з перадавых камандзіраў. Ён праводзіў работу сярод насельніцтва, быў ініцыятарам распрацоўкі, падрыхтоўкі і выканання баявых аперацый па разгроме нямецкіх гарнізонаў, дыверсій на чыгунках.



Мікалай Піліпавіч Каралёў

У адказ гітлераўцы пачалі прымяняць карныя меры. Яны нечакана наязджалі ў вёскі, рабілі засады на дарогах. У выніку партызаны панеслі першыя страты: 1 верасня 1941 года каля в. Амінавічы загінулі К. Рубінаў і І. Лебедзеў.

У сакавіку 1942 года у раёне афіцыйна арганізаваўся першы партызанскі атрад № 210, які пазней атрымаў імя І. В. Сталіна. Сумчанку прызначылі начальнікам штаба атрада (са жніўня 1942 г. па сакавік 1943 г. Сумчанка выконваў таксама абавязкі камандзіра 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады, а затым – намесніка камандзіра брыгады па разведцы).



Летняя база 210-га партызанскага атрада

На пачатак 1942 года вырасла і ўзмацнілася падполле. Падпольшчыкі дапамагалі партызанам дастаўляць соль, медыкаменты, друкарскі шрыфт, фарбу, збіралі звесткі аб руху вайсковых эшалонаў ворага. 19 жніўня 1942 года падпольшчыкі паведамілі партызанам аб маючай адбыцца блакадзе брыгады. Месца дыслакацыі было зменена, і задума фашыстаў была сарвана.

**РАШЭННЕ ЎПАУНАВАЖАНАГА ЦК КП(б)Б ПА МАПЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**І. М. КАРДОВІЧА**

**АБ СТВАРЭННІ 1-й АСІПОВІЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ**

**12** лютага **1943 г., лес Усакша**

РЕШАЮ:

1. Объединить вновь организованные партизанские отряды № 211, 212 и 213 в партизанскую бригаду. В партизанскую бригаду входят следующие отряды: № 210 (Короля), 211, 212 и 213.

2. Назвать бригаду «1-я Осиповичская партизанская бригада».

3. Утвердить командиром бригады т. Сумченко Степана Сергеевича, с одновременным выполнением обязанностей командира 210 п/отряда, комиссаром бригады и комиссаром 210 партизанского отряда утверждаю Глотова Василия Васильевича.

Поручить Осиповичскому РК КП(б)Б освободить тов. Глотова от обязанностей секретаря партбюро партизанского отряда № 210.

Освободить тов. Шиенок Александра Васильевича от обязанностей комиссара 210-го партизанского отряда как несправившегося с работой.

5. Просить ЦК КП(б)Б утвердить настоящее решение. Уполномоченный ЦК КП(6)Б по Могилевской области (Карлович).

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр.149.Л, 13.*

Сцяпан Сяргеевіч не толькі кіраваў, але і сам з'яўляўся адважным воінам. У снежні 1942 года на чале групы з сямі партызан ён зрабіў засаду на дарозе каля в. Паташня. Дзве машыны з гітлераўцамі былі знішчаны. У канцы 1942 года пры ўдзеле падпольшчыкаў ён падрыхтаваў дыверсійную аперацыю на ўчастку

чыгункі Пухавічы – Бабруйск. У жніўні 1943 года пад кіраўніцтвам і пры асабістым удзеле Сумчанкі на чыгунцы Мінск – Бабруйск партызанамі Асіповіцкай брыгады было ўзарвана 1000 рэек і знішчана чыгуначная станцыя Асіповічы – 2-я.

Вялікую ролю адыграла партызанская разведка ў падрыхтоўцы і правядзенні “Рэйкавай вайны”. Сцяпан Сяргеевіч як адзін з арганізатараў гэтай аперацыі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Адчуўшы ўдары партызан і падпольшчыкаў, панёсшы страты ў жывой сіле і тэхніцы, гітлераўцы пачалі рыхтаваць контрмеры па ліквідацыі партызанскага руху ў раёне і падполля ў горадзе Асіповічы.

Сумчанка атрымаў паведамленне, што акупанты ў Асіповічах умацоўваюць тайную палявую паліцыю (ГФП), службу бяспекі (СД), арганізавалі аддзяленне штаба “Валі” (ваеную разведку), рэзідэнтуру “Зондэрштаба Р” (якую ўзначальваў Віктар Курцын), а ў в. Вяззе размясцілі карны атрад немца-каланіста Бішлера. Кіраўнік бабруйскага аддзялення “Зондэрштаба Р” Андрэй Арскі, якому падпарадкоўваўся Курцын, ускладаў на яго вялікія надзеі ў барацьбе з партызанамі і ліквідацыі падполля ў Асіповічах, паколькі Курцын меў тут сваякоў і знаёмых сярод чыгуначнікаў. Аднак, як толькі Курцын прыбыў у Асіповічы, ён быў выяўлены як агент нямецкай разведкі.

Выкарыстоўваючы сваякоў і знаёмых, Курцын вёў вярбоўку сваёй агентуры (карэкціруючы свае дзеянні з камендантам асіповіцкай мясцовай камендатуры зондэрфюрэрам Валянцінам Капам, праз якога дасылаліся данясенні ў бабруйскае аддзяленне “Зондэрштаба Р” Арскаму).

Неяк праз свайго агента Курцын перадаў у партызанскую брыгаду ліст, у якім прасіў асабістай сустрэчы з камандзірам, абяцаў дапамагчы партызанам у барацьбе з акупантамі. Першую сустрэчу з Курцыным разведчыкі партызанскай брыгады правялі ў в. Паташня. Курцын прызнаўся, што працуе на ворага, прынёс шмат шкоды савецкаму народу і сваёй работай на партызан хоча загладзіць віну.

К канцу 1943 года ў Асіповічах становішча для падпольшчыкаў ускладнілася. Былі арыштаваны В. П. Ждановіч, Н. Д. Бугар, звязаныя з імі М. С. Шведаў, А. Ф. Лемеш, В. К. Малевіч, А. С. Крот,

М. М. Няверка аказаліся пад пагрозай арышту. Камандаванне партызанскай брыгады загадала гэтым падпольшчыкам пакінуць горад і размясціцца ў партызанскіх атрадах.

Па прапанове Сумчанкі кіраваць падполлем у Асіповічах было даручана Аляксандру Фёдаравічу Чайкоўскаму і Васілю Паўлавічу Сенюку.

Працягваючы работу на немцаў, Курцын перадаў партызанам тапаграфічную карту з указаннем на ёй партызанскіх атрадаў раёна, фармулярныя карткі на кожны атрад, у якіх было адзначана найменне атрада, яго колькасць, месца знаходжання, камандны склад, узбраенне, наяўнасць кухань, пякарань, калодзежаў, магчымасць маральнага разлажэння атрада і меры барацьбы з партызанамі. У картцы на 1-ю Асіповіцкую партызанскую брыгаду, на змешчанае там пытанне “меры барацьбы” стаяў адказ: “належыць фізічнаму знішчэнню”. Курцын паведаміў, што ў Бабруйску ёсць школа Абвера па падрыхтоўцы агентаў для засылкі ў тылы Чырвонай арміі і партызанскія атрады. Курцын абяцаў паведаміць, хто з агентаў будзе закінуты ў асіповіцкія партызанскія атрады.

Праз два тыдні пасля першай сустрэчы, С. Сумчанка і А. Ф. Ганчаронак, якіх ахоўвала група партызан, сустрэліся з Курцыным на лузе левага берага р. Свіслач насупраць в. Орча. Курцын паведаміў Сумчанку, што “Зондэрштабам Р” у Асіповіцкую партызанскую брыгаду закінуты агент Крукаў, паказаў маршрут яго руху і перадаў яго пашпарт з сапраўдным прозвішчам. Каб канчаткова пераканацца ў праўдзівасці намераў Курцына працаваць на партызан, Сумчанка даў яму магнітную міну і загадаў правесці ўзрыў на Асіповіцкім маслазаводзе (на пачатку новага 1944 г. Курцын выканаў гэта заданне).

Пасля сустрэчы з Курцыным на пошук агента Крукава была накіравана група партызан на чале з Ганчаронкам. Крукаў быў затрыманы ў раёне в. Орча і дастаўлены ў штаб брыгады. Крукаў прызнаўся, што працаваў на немцаў, расказаў аб вядомых яму курсантах, якія вучацца ў школе падрыхтоўкі агентаў. Каб заваяваць давер партызан, Курцын, узгадніўшы свае дзеянні з камендантам Копам і рэзідэнтам Арскім, накіраваў у атрад пад выглядам ваеннапалонных двух агентаў пад мянушкамі Ліпко і Марк, а партызанам паведаміў іх прыкметы. У выніку агента Ліпко

затрымалі ў партызанскім атрадзе № 212 імя Кірава (потым перайменаванага ў атрад імя Сумчанкі), а Марка – у атрадзе № 211 імя Ракасоўскага.

Позняй восенню 1943 года Сумчанка далажыў камандзіру брыгады М. П. Каралёву, што збіраецца на сустрэчу з Курцыным. Мікалай Піліпавіч праявіў цікавасць да гэтай сустрэчы і выказаў намер інкогніта прысутнічаць на ёй. Сумчанка пагадзіўся. Сустрэча адбылася ў пасёлку Воля, у доме Муравіцкіх. Сумчанка ўсё больш уцягваў Курцына ў працу на партызан. Нягледзячы на тое, што Курцын выдаў частку нямецкай агентуры, завербаваных ім асабіста агентаў з ліку партызан і мясцовага насельніцтва не выдаваў. У выпадку неабходнасці ён разлічваў выкарыстаць сваю агентуру супраць партызан. Між тым, Сумчанка паставіў перад здраднікам чарговую задачу: аказаць садзейнічанне партызанам па ўкараненні ў бабруйскую разведшколу. Курцын згадзіўся, але поспеху не абяцаў, маўляў, становішча на германскім фронце нестабільнае і могуць быць перамяшчэнні ўстаноў разведкі.

У снежні 1943 года, у сувязі з адступленнем гітлераўскай арміі, бабруйскую рэзідэнтуру “Зондэрштаба Р” перавялі ў Варшаву. Курцына перадалі ў прамое падпарадкаванне каменданту Копу і супрацоўніку штаба “Валі” (ваенная разведка) капітану Гартэну. Аб гэтым Курцын праінфармаваў Сумчанку праз сувязную Вольгу Муравіцкую.

6 студзеня, раніцай, партызан Пётр Лапатка прыйшоў на кватэру да Курцына і перадаў яму просьбу Сумчанкі: прыбыць 7 студзеня да яго на сустрэчу ў дом лесніка Вікенція Сташэўскага. У гэты ж дзень, тайная палявая паліцыя (ГФП) разыграла “арышт” Курцына і Муравіцкай. Сумчанку аб гэтым “арышце” было невядома, і ён, узначаліўшы групу партызан у складзе Марка Шведава, Браніслава Сташэўскага, Вікенція Караля, Аляксея Ганчаронка, выйшаў з партызанскай базы ва ўрочышчы Расоха да месца назначанай сустрэчы з Курцыным. Мэтай партызан была перапраўка ў брыгаду солі, якая была схавана ў лясной зямлянцы, і атрыманне ад Курцына інфармацыі аб выніках перамоў з Гартэнам аб накіраванні Муравіцкай у бабруйскую разведшколу.

Раніца 7 студзеня 1944 года была пахмурная, але мароз не здаваў. Сумчанка, Шведаў і Сташэўскі пад’ехалі да дома лесніка асцярожна. Тут у пустым доме лесніка Сташэўскага, кіламетрах у

сямі ад Асіповіч, адбылася сустрэча з гарадскімі падпольшчыкамі-чыгуначнікамі.

Падпольшчыкі перадалі партызанам разведанныя і поўныя спісы ўсёй падпольнай арганізацыі горада, таму што ў партызанскім штабе злучэння рыхтаваліся прадстаўляць падпольшчыкаў да урадавых узнагарод. Акрамя гэтага, асіповіцкім хлопцам удалося вывезці з нямецкіх складаў некалькі мяшкоў солі, якія яны прывезлі да Свіслачы на падводах. Гэта быў каштоўны падарунак падпольшчыкаў да Каляд, таму што і партызаны, і насельніцтва вёсак пакутавалі без солі, а дастаць яе не было дзе.

У той жа вечар Сцяпан Сяргеевіч адправіў некалькі партызан з падводамі ў атрад, каб хутчэй даставіць соль. Сам жа ён з трыма партызанамі застаўся начаваць у невялікай лясной зямлянцы каля Свіслачы. У ноч з 6 на 7 студзеня 1944 года партызаны пераначавалі ў лясной зямлянцы, размешчанай за чатыры кіламетры ад месца сустрэчы. Астатнія партызаны на чале з Ганчаронкам былі пакінуты для пераправы солі цераз Свіслач і транспарціроўкі яе на базу ў Расоху.

Лес пачаў радзець, і хутка адкрылася невялікая паляна, на якой адзінока стаяў пусты дом лесніка Сташэўскага. Справа паляна абмяжоўвалася ракой Сіняй. Пакінуўшы каня ў лесе, Сумчанка з партызанамі пайшоў да хаты, у якой яго чакалі 2 партызаны з атрада Падгайнага. Дом быў пусты, яго сцены былі пакрыты снежнай куржавінай. Павітаўшыся, Сумчанка загадаў Бернусу Сташэўскаму прынесці ўзрыўчатку, схаваную за кіламетр ад дома ў тайніку (дзе была схавана асабістая маёмасць Сташэўскіх). Бернус пайшоў выконваць загад.

Назаўтра павінна была адбыцца яго сустрэча з Віктарам Курцыным. Чаму ў С. С. Сумчанкі прытупілася прафесійнае чуццё чэкіста і ён пайшоў на сустрэчу з сакрэтнымі спісамі і толькі з дваімі партызанамі – Маркам Шведавым і Station Браніславам Сташэўскім? Відаць, паверыў, што В Курцын сапраўды чыстасардэчна дапамагае партызанам. Аб гэтым сведчылі і яго апошнія справы на карысць партызан. Ды і сустрэча гэта была ўжо чацвёртая.

“Вось было б добра пакурыць!” – сказаў нехта з партызан. Табаку ні ў каго не было, і Сумчанка прапанаваў Шведаву залезці на гару і пашукаць каранёў самасаду. Шведаў палез і праз акно ў


М.С.Шведаў.

франтоне ўбачыў, што дом ціха акружаюць гітлераўскія карнікі. Больш сотні на чатырох партызан…Хутка саскочыўшы, ён далажыў аб убачаным. Першай думкай Сумчанкі была трывога аб тым, што фашысты захопяць у яго планшэце спіс асіповіцкіх падпольшчыкаў і ўся арганізацыя загіне.

– Рабяты, – звярнуўся ён да партызан, – трэба пратрымацца, пакуль я дабяруся да рэчкі – у мяне спіскі.

Адзін з партызан залёг на парозе дома і адкрыў агонь па немцах. Там ён і загінуў, прыкрываючы адыход камандзіра да ракі. На тым месцы група Дабрадомава знайшла акрываўлены маскхалат. Два другія партызаны заляглі за хлевам. Адзін з іх загінуў, а другі – М. Шведаў – быў цяжка паранены разрывам міны, яму пашкодзіла бядро і нагу,ён страціў прытомнасць і ляжаў у снезе, сцякаючы крывёю.

Сумчанка бачыў, як палі смерцю храбрых Іван Кавалёў і яго таварыш з атрада Падгайнага, цяжка паранены Марк Шведаў. Сцяпан Сяргеевіч адстрэльваўся ад наступаючых з надзеяй вырвацца з акружэння. Ён падпоўз да праталіны на рэчцы Сіняй, увайшоў у ледзяную ваду, утапіў планшэт з дакументамі, потым выйшаў на левы бераг і папоўз да магутнага дуба, што стаяў на ўзгорку. Сумчанка хацеў схавацца за дрэвам ад куль карнікаў. Але і тут яго чакала засада: гітлераўцы прапанавалі здацца.

Калі ў пачатку студзеня 1944 года С. С. Сумчанка не вярнуўся са свайго чарговага разведвальнага паходу, М. П. Каралёў, які к гэтаму часу атрымаў воінскае званне генерал-маёра і званне Героя Савецкага Саюза, даручыў Б. В. Дабрадомаву, намесніку начальніка штаба партызанскага злучэння, выйсці з трэцяй ротай Д. Шрэйна на месца бою і высветліць, што здарылася.

Сляды С. С. Сумчанкі прывялі партызан – ужо пасля трагедыі – да р. Свіслач, якая тады яшчэ не замерзла. Не рашыўшыся кінуць планшэт у незамерзшую раку, баючыся, што ён успльве і

дастанецца ворагу. Сумчанка павярнуў улева, дабраўся да ракі Сіняй, якая ўжо была пакрыта лёдам. Там партызаны з групы Дабрадомава знайшлі прабіную нагой палонку, у якой і былі ўтоплены спісы асіповіцкіх падпольшчыкаў. Разумеючы, што немцы будуць шукаць дакументы, Сумчанка ўкінуў у ваду спачатку спісы, а потым сам планшэт. Пасля гэтага Сцяпан Сяргеевіч залёг на беразе р. Сіняй пад вялікім дубам і адкрыў агонь з аўтамата па наступаўшых паліцаях. Дорага каштавала ворагам смерць Сцяпана Сумчанкі. А калі закончыліся патроны, ён выхапіў гранату і вырваў з яе чаку. Ад выбуху загінуў сам і тыя нямецкія памагатыя, якія імкнуліся захапіць яго жывым. Так апісвае смерць героя Б. В. Дабрадомаў у сваіх успамінах, а ў гісторыка-дакументальнай хроніцы “Памяць. Асіповіцкі раён” смерць С. С. Сумчанкі пададзена наступным чынам: “...разрыўной куляй быў цяжка паранены. Галава яго апусцілася ў снег, па назе пацякла кроў. Ён прыўстаў, падняў да скроні пісталет з апошнім патронам і стрэліў...”

Аб падрабязнасцях гераічнай смерці Сумчанкі, якіх групе не ўдалося адразу ўстанавіць шляхам даследвання, расказаў пасля прыходу Чырвонай Арміі Марк Шведаў, адзіны, хто застаўся жывы пасля таго бою. Ён быў захоплены фашыстамі ў беспрытомным стане і дастаўлены ў Бабруйск. Праз некалькі дзён адтуль паступіла важнае паведвмленне: у тутэйшы шпіталь патрапіў цяжка паранены Шведаў. Важнасць бачанага ім была такой вялікай, што камандаванне Асіповіцкай ВАГ прыняло рашэнне правесці вельмі рызыкоўную аперацыю па выкраданні параненага партызана. Акцыя завяршылася паспяхова: Шведава ўдалося схаваць у адной з глухіх вёсак Старадарожскага раёна.

**ПАСТАНОВА БЮРО АСІПОВІЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б**

**ПА ІНФАРМАЦЫІ Р.М. ВАЙЦЯНКОВА**

**АБ ГІБЕЛІ НАМЕСНІКА КАМАНДЗІРА ЗЛУЧЭННЯ ПА РАЗВЕДЦЫ С.С. СУМЧАНКІ**

**12 студзеня 1944 г.**

Заслушав информацию тов.Войтенкова о смерти тов.Сумченко С.С., РК КП(б)Б отмечает, что гитлеровские бандиты, вырвавшие из наших рядов тов.Сумченко, нанесли большую утрату всему соединению партизан нашего района. В лице тов.Сумченко мы потеряли одного из первых организаторов партизанского движения в нашем районе, прекрасного командира и организатора, скромного и подлинного большевика, замечательного товарища и требовательного командира.

За время нахождения в тылу врага в рядах народных мстителей тов.Сумченко как верный сын своей Родины и народа, как подлинный большевик и патриот, не жалея ни своих сил, ни энергии принимал все зависящие от него меры для наибольшего нанесения потерь и вреда ненавистным фашистским захватчикам.

Дело борьбы с врагом, общее дело у тов.Сумченко было на первом месте. В своей боевой деятельности, организаторской и деловой работой тов.Сумченко показал образцы подлинного патриотизма, преданности делу партии и народа, большевистской скромности и жгучей ненависти к гитлеровским захватчикам.

1. Учитывая большие заслуги тов.Сумченко перед Родиной, народом и партией Ленина-Сталина, поставить вопрос перед командованием о посмертном представлении тов.Сумченко к присвоению звания Героя Советского Союза.

2. В каждом отряде и подразделении помимо общего боевого плана завести специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко».

3.Отрядам и подразделениям, у которых этот специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко» будет наибольшим — присваивать звание имени Сумченко.

4. Создать из лучших боевых партизан в отрядах и подразделениях охотничьи группы мстителей за смерть тов.Сумченко, в задачу которых должно входить уничтожение командного состава гитлеровцев.

5. Среди коммунистов и комсомольцев на партийно-комсомольских собраниях обсудить данное решение, широко осветить работу и деятельность тов.Сумченко в тылу врага как пример для каждого коммуниста и комсомольца и на основе этого еще более поднять боеспособность коммунистов и комсомольцев, а также всего личного состава отрядов и подразделений.

6. О ходе обсуждения данного решения и проводимых на основе этого мероприятий информируйте РК партии специальными донесениями и сообщением в политдонесении.

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков

***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 152. Л. 52.***

**З ПРАТАКОЛА № 1 ЗАКРЫТАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДА 214-га ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА**

**16 студзеня 1944 г.**

СЛУШАЛИ: Постановление бюро Осиповичского подпольного РК КП(б)Б от 12.1.44 года о смерти тов.Сумченко Степана Сергеевича.

Зачитал постановление и сделал информацию о смерти тов.Сумченко тов.Подгайнов.

Высказались тов.Пинчук М.С., Бакун М.Г., Оликевич А.Л., Тютюн И.Я., Гончаронок С.Н.

ПОСТАНОВИЛИ:

1. Постановление РК КП(6)Б принять к повседневному руководству и претворению в жизнь всех указаний, мобилизуя весь личный состав отряда на усиление ударов по немецко-фашистским мерзавцам.

2. Провести траурное собрание со всем личным составом отряда, на котором осветить весь боевой путь и заслуги перед Родиной т.Сумченко С.С. и трех разведчиков отряда Борозны М.А., Коваля И. и Бородавки И.

3 Организовать в каждой роте по одной охотничьей группе по охоте за башкеровцами и их боевые дела заносить на специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко».

4. Разведке отряда в связи с потерей лучших разведчиков... усилить работу в изучении противника и предоставлении полных сведений...

Председатель собрания Бакун

Секретарь Пинчук

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 152. Л. 61 — 64.*




Сумчанка – выдатны майстар партызанскай вайны – загінуў у выніку здрады. Хто выдаў адважнага партызанскага камандзіра – засталося нявысветленым. Кіраўніцтва партызанскага руху ўспрыняло абставіны смерці Сумчанкі як сведчанне недастатковай кампетэнтнасці камандавання Асіповіцкай ВАГ, за што М. Каралёў атрымаў вымову.

Цела Сумчанкі і яго баявых паплечнікаў былі пахаваны немцамі ў в. Вяззе. Праз паўгода, калі Чырвоная Армія вызваліла Асіповіцкі раён, з воінскімі ўрачыстасцямі партызаны перазахавалі герояў у г. Асіповічы. За бліскуча праведзеную ў раёне аперацыю “Рэйкавая вайна” С. С. Сумчанка ў 1943 годзе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.



*Брацкая магіла партызан*

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, С. С. Сумчанка пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Галоўная вуліца ў Асіповічах пасля вайны была названа яго імем.




*Мемарыяльны знак Сумчанку С. С. на скрыжаванні вуліц Сумчанкі і Інтэрнацыянальнай*

Бішлераўцы пасля апошняя для Сумчанкі бою, ужо ў Вяззі пасля пахавання партызан, размахвалі планшэтам, які быццам вылавілі ў рацэ, але якія там былі дакументы – не гаварылі, бо не ведалі. Немагчыма дапусціць, што Сумчанка, кідаючы ў ваду планшэт, не парваў спісы: час залегчы, адстрэльвацца да апошняга патрона і ўзарваць сябе і ворагаў апошняй гранатай у яго быў.

Д. Саўрыцкі ў сваім артыкуле “Виктор Курцын – супершпион? Или История одного предательства” прыводзіць доказам таго, што спісы трапілі да немцаў, арышт немцамі групы Санковіча. Выказанае меркаванне Д. Саўрыцкага аб

тым, што хваля арыштаў пракацілася па асіповіцкім падполлі адразу пасля смерці Сумчанкі, не пацвярджаецца. Чарговы ўдар па асіповіцкім падполлі быў нанесены ў лютым 1944 года. Карным атрадам Бішлера быў арыштаваны кіраўнік рускага акупацыйнага банка Пётр Жук. Падпольшчыкам Васілю Санковічу, Сцяпану Бабіцкаму, Канстанціну Пармону і яго сыну ўдалося пайсці ў партызанскі атрад (бацька і сын пазней у адным з баёў загінулі). Калі б у руках немцаў былі тыя спісы, то ці сталі б яны чакаць да лютага – знішчэнне падполля пачалося б у той жа дзень.

Ветэраны, якія засталіся жывыя, выказалі такую пазіцыю: “Пра Сумчанку ўсе матэрыялы засакрэчаны, яго выдаў здраднік. Людзі, якія гэта дакладна ведалі, былі ў Асіповічах пасля вайны працяглы час. Дакументы, якія б маглі праліць святло на гэту справу, у доктара. Прозвішча гэтага доктара ніхто не называе. Толькі я вам нічога не гаварыў, і на мяне вы не спасылайце”. Вось такая размова адбылася ў кіраўніка пошукавага атрада “Узлёт” і гуртка “Дараганазнаўства” Каралені Ж. С. у лістападзе 2009 года ў г. Асіповічы...

На гэтым свеце ўжо, відаць, ніхто гэтае шматкроп’е на кропку не земеніць. Але там, дзе, як мы ўсе і спадзяемся, і баімся адначасова, існуе справядлівы суд, ад якога не ўтоіцца нічога, там кропка, хутчэй за ўсё, ужо даўно пастаўлена. 70 гадоў як не стала С. С. Сумчанкі, але да гэтага часу няма сярод жывых і таго чалавека, на каго пала цень падазрэння. Доказаў нічыёй прамой віны ў гэтай трагедыі адразу пасля вайны не знайшлі.

У вёсцы Сялец, што за некалькі кіламетраў ад Дараганава, у гады вайны адбыўся такі трагічны выпадак. Адна жанчына (яе хата знаходзілася на ўскрайку вёскі) пасціла на ноч партызан, а сама ў той вечар схадзіла да сваёй радні ў в. Птушычы. З гэтай вёскі некалькі чалавек служылі ў паліцыі. У гэты ж час хтосьці з мужчын Сяльца пайшоў у паліцыю і расказаў, у чыёй хаце начуюць партызаны. Немцы і паліцаі наладзілі засаду, і раніцай усе партызаны, калі яны хацелі прарвацца ў лес праз поплаў р. Пціч, былі забітыя. Немцы тую жанчыну, якая хавала і карміла народных мсціўцаў, не зачапілі, каб усе падумалі, што гэта яна схадзіла ў паліцыю і выдала. Так і здарылася. І яе, і дзяцей партызаны забілі – як памагатых фашыстаў. А той мужчына-здраднік яшчэ доўга жыў пасля вайны, памёр сваёй смерцю і пахаваны на адных могілках з

тымі, чыя кроў на яго руках. Ніхто не асмеліўся сказаць супраць яго што-небудзь – баяліся, што спаліць ноччу ўсю сядзібу.

Сумчанка, Флегантаў, Нічыпаровіч... Колькі яшчэ было сапраўдных Герояў, якім не трэба было ледзь не брацца за грудзі ў байцы, каб падзяліць падзвігі, як у выпадку са славутай дыверсіяй Ф. Крыловіча, “калі адразу тры партызанскія камандзіры зрабілі справаздачу перад Масквой аб гэтай удала праведзенай аперацыі і атрымалі высокія дзяржаўныя ўзнагароды. Нічога не атрымаў толькі выканаўца гэтай самай выдатнай і рэзультатыўнай аперацыі, якую здзейснілі партызаны ў час Вялікай Айчыннай вайны, – Фёдар Крыловіч. Пра яго забыліся. Успомнілі толькі ў 1949 годзе, калі адзначалі 30-годдзе ўтварэння БССР, узнагародзіўшы ордэнам Леніна”. Пасля смерці Крыловіча адна з вуліц горада была названа ў яго гонар. У 2009 годзе ў г. Асіповічы адкрыты помнік Ф. Крыловічу. Помнік узведзены на грошы, зарobленыя нашымі землякамі на суботніках.



*Помнік Ф. Крыловічу*

Мы не хочам ні прынізіць, ні абвінаваціць нікога, а нізка схіліць галовы перад сапраўднымі героямі апошняй вайны. Мы стараемся высвятліць для сябе і паказаць зацікаўленаму чытачу, што сваім ратным подзвігам Сцяпан Сяргеевіч Сумчанка дастойна заслужыў самае высокае званне – званне Народнага Героя зямлі беларускай.

**Літаратура:**


Адзін з першых: С. С. Сумчанка // Памяць. Асіповіцкіраён. — Мінск, 2002. — С. 277—280.

Караленя, Ж. Сцяпан Сяргеевіч Сумчанка: трагічная смерць партызанскага камандзіра / Жанна Караленя // Могилёвский поисковый вестник / составитель Н. С. Борисенко. — Могилёв, 2012. — Вып. 7. — С. 178—197.

Сумченко Степан Сергеевич [Электронный ресурс] // Will-remember.ru : сайт. — Режим доступа: http://will-remember.ru/familii_na_s/sumchenko_stepan_sergeevich.htm

Сумченко Степан Сергеевич // Их именами названы... : энциклопедический справочник. — Минск, 1987. — С. 581.